СУВЯЗНАЕ ЗВЯНО

# Унёсак рэгіёнаў

## Як Жодзіна развівае адносіны Беларусі і Пакістана

**Супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Пакістанам сёння развіваецца паскоранымі тэмпамі. У кастрычніку 2016 года паміж дзяржавамі быў падпісаны пакет дакументаў аб развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах, а некалькі тыдняў таму Прэзідэнт заявіў, што да 2020 года ўзаемны тавараабарот можа дасягнуць 1 млрд долараў.**

У пачатку лютага дэлегацыя Пакістана на чале са старшынёй Сената парламента Міянам Раза Рабані наведала нашу краіну. У рамках праграмы госці адправіліся ў Жодзіна. Наш карэспандэнт пагутарыў са **старшынёй Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў Наталляй СУШКО** пра вынікі гэтага візіту.

**— Наталля Міхайлаўна, якім чынам сёння супрацоўнічаюць Жодзіна і Пакістан?**

— Узаемадзеянне з Пакістанам у нас ідзе праз наша горадаўтваральнае прадпрыемства БелАЗ. Яго супрацоўніцтва з будаўнічымі і здабываючымі пакістанскімі кампаніямі пачалося яшчэ ў 1968 годзе. Тады ў Пакістан была адпраўлена буйная партыя нашых самазвалаў — гэта дваццаць шэсць адзінак БелАЗ-540 грузападымальнасцю 27 тон. Гэтыя легендарныя машыны з'яўляюцца папярэднікамі 30-тонных кар'ерных самазвалаў, якія запатрабаваны ў пакістанцаў на сучасным этапе адносін. У 2008 годзе таксама быў здзейснены візіт кіраўніцтва Пакістана на Беларускі аўтамабільны завод, адбылася сустрэча з дырэктарам Пятром Пархомчыкам, дзе бакі спрабавалі знайсці пункты судакранання і абмяркоўвалі далейшае супрацоўніцтва.



Мы працуем сумесна ўжо доўгія гады, але і сёння развіваем нашы адносіны.

**— Два тыдні таму парламенцкая дэлегацыя Пакістана наведала БелАЗ. Як сустракалі высокіх гасцей?**

— Дэлегацыю мы сустрэлі хлебам і соллю, пасля чаго павялі іх у музей, каб пазнаёміць з падзеямі ў гісторыі нашага галоўнага прадпрыемства. Дарэчы, у 2018 годзе БелАЗу споўніцца 70 гадоў — гэта сур'ёзны юбілей, да якога рыхтуюцца ўсе. Таму мы палічылі неабходным паказаць гасцям усе віды тэхнікі, якія выраблюць і выраблялі на нашым прадпрыемстве. Дэлегацыю сапраўды здзівіў 450-тонны кар'ерны самазвал БелАЗ-75710, занесены ў Кнігу рэкордаў Гінэса. У канцы візіту старшыня Сената парламента Міян Раза Рабані сказаў, што ўсю нашу тэхніку трэба занесці ў Кнігу рэкордаў — настолькі ён быў уражаны. Сам кіраўнік Сената парламента вельмі глыбока ўнікаў ва ўсе аспекты гэтай экскурсіі, пастаянна задаваў пытанні. Пасля гэтага адбыліся перамовы.

**— Пра што дамовіліся бакі?**

— Спачатку дырэктар Пётр Пархомчык прадставіў інфармацыю аб прадпрыемстве, аб планах і перспектывах кампаніі, а таксама пра тое, якія сёння выпускаюцца мадэлі і якія перадавыя тэхналогіі выкарыстоўваюцца пры іх стварэнні. Асобна мы расказалі і пра горад — пра асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Жодзіна, дэмаграфічную сітуацыю, пра развіццё сацыяльнай інфраструктуры. Таксама членам Сената было цікава даведацца пра арганізацыю работы Савета дэпутатаў базавага ўзроўню і кампетэнцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў. Справа ў тым, што за 2015—2016 гады падпісаны чатыры дакументы аб супрацоўніцтве БелАЗа з Пакістанам, у тым ліку пагадненне аб пастаўцы двух кар'ерных самазвалаў БелАЗ-75135, таму візіт быў хутчэй азнаямленчым, каб дэлегацыя змагла знутры пазнаёміцца з вытворчасцю машын, якія потым запрацуюць на іх кар'ерах.

**— Сёння паміж Беларуссю і Пакістанам таксама заключаны шэраг пагадненняў аб узаемным супрацоўніцтве ў сферы адукацыі. У прыватнасці, падпісаны дагавор паміж БНТУ і Лахорскім універсітэтам інжынірынгу і тэхналогій. А Жодзінскі дзяржаўны політэхнічны каледж — філіял БНТУ — працуе з Пакістанам?**

— Мы былі б рады, каб студэнтаў нашай навучальнай установы нейкім чынам далучылі да гэтага супрацоўніцтва, і з задавальненнем паказалі б пакістанскім студэнтам нашу матэрыяльна-тэхнічную базу. Магчыма, хто-небудзь выкажа бы жаданне навучацца тут. Мы адкрыты і заўсёды гатовы разгледзець любыя прапановы. Аднак пакуль, наколькі мне вядома, наш політэхнічны каледж не чакае студэнтаў з Пакістана.

**— У перспектыве ваш політэхнічны каледж можа дамовіцца аб супрацоўніцтве. Жодзінская навучэнцы гатовы да вучобы ў незнаёмай дзяржаве?**

— Пакуль мы не ведаем, чым пакістанскі бок можа быць прывабным для нас. Але пачынаць зносіны трэба. Няхай пакістанскія студэнты прыедуць у Жодзіна, паглядзяць, як тут праходзіць працэс навучання. Узаемаабмен — гэта таксама вучэнне. Размаўляючы з грамадзянамі іншай дзяржавы, іншага менталітэту і іншай культуры, мы ўсё роўна штосьці для сябе здабываем.

**— Каб у Жодзіна пастаянна прыязджалі патэнцыйныя інвестары, трэба быць да гэтага гатовымі. Якія найбольш вострыя праблемы сёння існуюць у горадзе і як яны вырашаюцца?**

— Глабальная праблема — гэта тое, што гораду няма куды развівацца. Ён у нас вельмі шчыльна забудаваны, вакол знаходзяцца землі сельскагаспадарчага прызначэння Смалявіцкага раёна. Сёння ў нас ёсць праект дэталёвай планіроўкі і генеральныя планы, па якіх асобныя мікраёны, калі б гэты дазвол быў атрыманы, маглі б забудоўвацца. Больш за пяць тысяч чалавек у Жодзіне маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, таму для нас вельмі важнае будаўніцтва жылля, а таксама развіццё сацыяльнай інфраструктуры. Адпрацоўка гэтых пытанняў сёння вядзецца на самым высокім узроўні.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

*lukashevich@zviazda.by*

СІТУАЦЫЯ

# Дарогі расчысцілі за два дні

## Спачатку людзі запанікавалі... Званкі паступалі адзін за адным

**Калі ў летні сезон асноўным клопатам сельскага Савета з'яўляецца работа па добраўпарадкаванні тэрыторый, скошванне травы, то зімой на першы план выходзіць стан дарог. Па дарозе нават у аддаленую вёску павінна заўсёды прыйсці аўтакрама, даехаць паштовая машына, не кажучы ўжо пра аўтамабіль хуткай дапамогі альбо іншы спецтранспарт экстранных службаў. Таму дарогі павінны быць расчышчаны заўсёды.**

Зразумела, што гэта справа дарожна-будаўнічых арганізацый, але сельскі Савет заўсёды сітуацыю трымае на кантролі, калі трэба, падключаецца. Так, у Хараўскі сельсавет Пружанскага раёна ўваходзіць 20 населеных пунктаў. Некаторыя з іх — Харава, Кабылаўка, Калядзічы — з насельніцтвам пад 600 чалавек, а сем вёсак маюць менш за 15 жыхароў, ёсць і такія, дзе пражывае адзін чалавек. Паміж населенымі пунктамі пралягае больш за 100 кіламетраў дарог, якія трэба трымаць у парадку. На мінулым тыдні нарабіў клопату і страху цыклон «Эрыка», які прынёс у рэгіён моцныя снегапады. За суткі 8-9 лютага выпала месячная норма ападкаў. Дарогі аказаліся засыпаныя снегам.

— Спачатку людзі злёгку запанікавалі, — расказвае **старшыня Хараўскага сельскага Савета Алёна ПСТЫГА.** — Званкі паступалі адзін за адным. Асабліва перажывалі жыхары аддаленых вёсак, пыталіся, як жа ім прывязуць хлеб, іншыя прадукты. Найперш мы стараліся супакоіць людзей, тлумачылі, што адлегласці вялікія, дарожнікі не могуць даехаць да кожнай вёскі адразу, трэба крышачку пачакаць.



Пенсіянерка Любоў ЖАБРУН і старшыня сельскага Савета Алёна ПСТЫГА.

Два дні работнікі Пружанскага ДРБУ-140 працавалі асабліва інтэнсіўна. Ужо 9-га ранкам мне патэлефанавала адзіная жыхарка вёскі Бортнавічы Любоў Максімаўна Жабрун і паведаміла, што да яе хаты дарогу расчысцілі, — працягвае расказ Алёна Рыгораўна. — А вечарам гэтага ж дня я праехала ў бок вёсак Скорцы, Носкі, Залессе, Хвалевічы. Дарэчы, Хвалевічы — адна з самых аддаленых вёсак сельсавета. І паўсюль без цяжкасці прайшла легкавая машына. Дарогі былі не толькі прыбраныя ад снегу, але і пасыпаныя пяском. Так што ўсе гандлёвыя і паштовыя машыны маглі наведаць населеныя пункты.

А ўжо 10 лютага я размаўляла па тэлефоне з прадаўцом аўтакрамы, якая абслугоўвае напрамак у бок Хвалевічаў. Яна паведаміла, што машына гатовая да выезду. Адзінае, за што хвалявалася гандлёвы работнік, каб малако і смятана не падмерзлі, на тэрмометры ў дзевяць раніцы было 16 градусаў марозу.

На тэрыторыі Хараўскага сельсавета дзейнічаюць два сельгаспрадпрыемствы: «АграКалядзічы» і «Айчына». Трэба сказаць, што гаспадаркі дапамагаюць населеным пунктам спраўляцца са снегам, калі яго выпадае асабліва многа. Так, староста вёскі Калядзічы расказаў, што ў вёсцы расчысцілі не толькі праезную частку, але і тратуары.

У такіх і падобных сітуацыях, якія правакуюць капрызы надвор'я, асаблівая ўвага ўдзяляецца тым вяскоўцам, якія маюць статус адзінокіх, а таксама пражываюць адзінока. Такіх па сельсавеце налічваецца 31 і 315 адпаведна. Пра былую даярку Любоў Жабрун ужо згадвалася ў газеце. Жанчына не толькі пражывае адзінока — яна адна на ўсю вёску Бортнавічы. І, як ужо сказана, наступствы снежных заносаў у яе вёсцы ліквідавалі ў першы ж дзень.

Пра адзінокіх людзей зімой, зразумела, трэба клапаціцца больш: ці дастаткова паліва, ці не замярзаюць. Тыя з іх, што становяцца зусім нямоглымі, атрымліваюць накіраванне ў бальніцу сястрынскага догляду. Дарэчы, у Хараве яшчэ ў савецкія часы таганчыны калгас імя Леніна абсталяваў адзіны ў раёне, а можа, і ў вобласці Дом ветэранаў такога кшталту. Адрамантавалі і добраўпарадкавалі пабудову 1960 года, набралі невялікі штат і зняшчалі на зіму адзінокіх ветэранаў калгаснай вытворчасці. Старыя людзі ішлі ў гэты дом ахвотна — бо ён жа знаходзіцца ў сваёй вёсцы, і супрацоўнікі, і суседзі па палатах знаёмыя. А вясной тыя, хто меў сілы, вярталіся ў родную хату. Для эканамічна моцнага калгаса затраты на ветэранаў не выглядалі вялікімі... Потым развал Саюза, змена кіраўніцтва калгаса, страта гаспадаркай былой моцы — адным словам, сёння той будынак належыць да разраду пустуючых і, хутчэй за ўсё, неўзабаве будзе знесены. Некалькі чалавек з Хараўскага сельсавета цяпер знаходзяцца ў Сухопальскай бальніцы сястрынскага догляду...

Не так даўно сельвыканкаму давялося займацца пахаваннем адзінокага чалавека. І вось на якую акалічнасць звярнула ўвагу кіраўнік мясцовай улады. Цяпер у райцэнтры ёсць і дзяржаўнае, і прыватнае рытуальныя прадпрыемствы. Іх супрацоўнікі па заяўцы выязджаюць нават у самую аддаленую вёску і робяць усё, што патрэбна ў такіх выпадках. А яшчэ некалькі гадоў таму гэта нярэдка станавілася праблемай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*yackevich@zviazda.by*

*Пружанскі раён.*